Зубчонак, Н. А.

Беларуская журналістыка ў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906—1916 гг.) : дапам. для студэнтаў Інстытута журналістыкі,

/ Н. А. Зубчонак. Мінск ; БДУ, 2010.

## 1.2. ПЕРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАЧ. ХХ ст.

У складаных умовах пачатку ХХ ст. ў Беларусі адбывалася афармленне сістэмы перыядычнай прэсы. У яе ўваходзілі самыя розныя выданні.

Тыпалогія друку складаецца гістарычна і заўсёды абумоўлена грамадска-эканамічнай фармацыяй. Сістэма беларускай прэсы гэтага перыяду ўзнікла падчас станаўлення капіталізму. У даследаваннях па пытаннях тыпалогіі за аснову вызначэння паняцця «тыпу» ў адносінах да перыядычнага выдання пакладзены тры галоўныя фактары, якія існуюць ў межах адной грамадска-эканамічнай фармацыі і вызначаюцца трыма галоўнымі родавымі элементамі масавых камунікацый: «суб’ект кіравання — журналістыка – аб’ект кіравання» або «выдавец — выданне — аўдыторыя» [40, с. 15]. Усе гэтыя фактары знаходзяцца ў дыялектычнай сувязі, ва ўзаемадзеянні. Характарыстыка кожнага з іх улічвае іншыя акалічнасці, а таксама дае ўяўленне аб іншых фактарах. Выдавец (яго спецыфіка і характар) вызначае функцыі выдання, якія, у сваю чаргу, уплываюць на выбар аўдыторнай групы і таксама ў значнай ступені вызначаюцца ёю.

Пры адсутнасці аднаго з галоўных фактараў, якія ўплываюць на стварэнне тыпу выдання, само выданне можа проста перастаць існаваць як тып. Можна дапусціць, што гэта адна з прычын таго, што ў сістэме друку Беларусі міжрэвалюцыйнага перыяду некаторыя тыпы выданняў былі прадстаўлены вельмі слаба. Напрыклад, дзіцячая аўдыторыя не была падрыхтавана да ўспрыняцця адпаведнай перыёдыкі; адсутнічала сталая традыцыя выдання сатырычнай літаратуры; сацыяльна-эканамічныя праблемы адсунулі на другі план асвятленне пытанняў развіцця культуры, літаратуры, спорту, прафсаюзнага і жаночага руху на старонках перыядычнага друку.

Міжрэвалюцыйны час ў Беларусі стаў пачаткам стварэння абсалютна новага тыпу выдання — нацыянальнай газеты (часопіса). Працы даследчыкаў па пытаннях тыпалогіі друку пацвярджаюць той факт, што працэс з’яўлення перыядычных выданняў абумоўлены ходам гісторыі. Новыя ўзнікаюць або шляхам развіцця, трансфармацыі, змянення характару старых, вядомых тыпаў, або пад уплывам змены грамадска-палітычных, эканамічных і іншых умоў. Сукупнасць гэтых акалічнасцей дазволіла ў свой час убачыць свет беларускай перыёдыцы.

Выхад у свет шэрагу нацыянальных выданняў, якія пачалі друкавацца на роднай мове, і стаў галоўнай асаблівасцю развіцця перыядычнай прэсы. Па сваім характары новыя газеты і часопісы былі ў асноўным грамадска-палітычнымі і літаратурнымі. Іх значэнне такіх паступова ўзрастала. Выданне на роднай мове стала цэнтрам асветніцкай, культурнай і грамадска-палітычнай работы па адраджэнню краю на шляху стварэння нацыянальнай дзяржавы.

Зразумела, гэтыя задачы прэсы не адпавядалі імперскім інтарэсам. Нацыянальныя выданні апынуліся ў найскладанейшых эканамічных і палітычных умовах, пад моцным ідэалагічным уціскам. Спробы ўрада спыніць распад Расійскай імперыі, падпарадкаваць сабе малыя народы выліліся ў доўгія і жорсткія дыскусіі паміж расійскімі і беларускімі выданнямі па пытаннях дзяржаўнасці. Аднак кладаная эканамічная і палітычная сітуацыя, у якой апынулася нацыянальная прэса, не стала перашкодай для яе далейшага развіцця.

На старонках першых беларускіх легальных перыядычных выданняў убачылі свет творы ўжо вядомых літаратараў і публіцыстаў. Чытачы атрымалі магчымасць пазнаёміцца з працамі вучоных па гісторыі і этнаграфіі свайго краю, атрымаць веды ў галіне эканомікі, палітыкі, права, сельскай гаспадаркі, медыцыны і інш.

Вывучэнне перыядычнай прэсы пэўнага перыяду – працэс даволі складаны, паколькі ён патрабуе правядзення не толькі класіфікацыі перыёдыкі, але і ўліку мадыфікацыі элементаў сістэмы, яе тыпаў (узнікненне, эвалюцыя, адміранне), а таксама змены сувязей выданняў у выніку дынамікі іх колькасці і якасці, змены сувязей тыпаў, рэканструкцыі іх ролі ў сістэме сектаральных задач [40, с. 26]. Праца гэта неабходная, паколькі колькасныя і якасныя змяненні сістэмы перыядычнага друку з’яўляюцца прамым адлюстраваннем эвалюцыі грамадска-палітычных адносін у краіне.

Калі падыходзіць да характарыстыкі перыядычных выданняў з пазіцыі іх класіфікацыі па форме, то можна падзяліць усе газеты і часопісы на некалькі груп. Напрыклад, у міжрэвалюцыйны перыяд распаўсюджваліся выданні трох тыпаў: «вялікія», «малыя» і «вулічныя лісткі». Да «вялікіх» можна аднесці штодзённую грамадска-палітычную прэсу, на старонках якой разглядаліся пытанні палітыкі, эканомікі, літаратуры і інш. У Беларусі імі з’яўляліся афіцыйныя газеты тыпу «Губернских ведомостей», «Епархиальных ведомостей», «Виленского вестника», а таксама беларускамоўная «Наша ніва».

Другую групу так званай «малой» прэсы складалі адносна невялікія буржуазна-ліберальныя выданні з даволі абмежаванай інфармацыйнасцю і перыядычнасцю. Гэта такія газеты, як «Белорусский голос», «Минские ежедневные ведомости», «Бобруйский курьер» і інш.

Для найменш забяспечаных слаёў насельніцтва друкаваліся газеты «лістковага тыпу». Найбольш папулярнымі былі «газеты-капейкі». Яны выходзілі амаль ва ўсіх вялікіх гарадах Паўночна-Заходняга краю.

У даследаваннях па праблемах тыпалогіі друку неаднаразова адзначалася, што эвалюцыя газетнай справы ў Расіі і яе правінцыях у пачатку ХХ ст. ішла ў тым жа кірунку, што і развіццё газетнай прэсы ва ўсім буржуазным свеце [49, с. 82]. Гэта яшчэ раз пацвярджае думку, што грамадска-эканамічная фармацыя вызначае дзейнасць сваіх галоўных інстытутаў, адным з якіх з'яўляецца прэса.

Друк – гэта складаная і дынамічная сістэма. У журналісцкай навуцы няма адзінага меркавання адносна таго, на якіх прынцыпах павінна быць заснавана класіфікацыя друкаваных сродкаў камунікацыі. Сёння ў яе аснову пакладзены ўзаемаадносіны паміж выдаўцом і аўдыторыяй. Выдавец (у шырокім сэнсе) вызначае мэты і функцыі выдання з пазіцыі свайго класа і структуры палітычнай арганізацыі грамадства, а таксама яго перыядычнасць, аб'ём, тэрыторыю. Аўдыторыя, зыходзячы са сваёй дыферэнцыяцыі па класавай, сацыяльнай, прафесійна-гаспадарчай, тэрытарыяльнай і іншых прыкметах, аказвае моцны ўплыў на ўзнікненне розных тыпаў газет і часопісаў. Патрабаванні выдаўца і попыт чытацкай аўдыторыі рэалізуюцца ў змястоўнай структуры выдання, дзе кожны з яе элементаў мае пэўную форму. Так, у дыялектычным адзінстве формы і зместу ў друку адлюстроўваюцца важныя тыпалагічныя характарыстыкі газет і часопісаў. Тут «змест выступае як прадукт дзейнасці гэтай сістэмы ў выглядзе дыскрэтнай інфармацыйнай плыні, разгорнутай у часе і прасторы» [5, с. 33].

У сувязі з тым, што сродкі масавай інфармацыі адлюстроўваюць усю сукупнасць аб'ектаў і з'яў акаляючай рэчаіснасці, дакладней, нашы веды і ўяўленні аб іх, даследчыкі часцей за ўсё звяртаюцца да прадмета тэматычнай класіфікацыі перыядычных выданняў. Можна вылучыць вялікія блокі, кожнаму з якіх будзе адпавядаць пэўны тып выдання: грамадска-палітычнае; вытворча-эканамічнае; навукова-педагагічнае; літаратурна-мастацкае; культурна-бытавое; спартыўнае; аб прыродзе і жывёльным свеце [5, с. 34]. У час сацыяльных пераўтварэнняў пераважаюць выданні пэўнага тыпу, у прыватнасці грамадска-палітычныя. У міжрэвалюцыйны перыяд журналістыка Беларусі была прадстаўлена амаль усімі названымі вышэй тыпамі перыядычных выданняў.

У пачатку ХХ ст. на фарміраванне сістэмы прэсы Паўночна-Заходняга краю вялікі ўплыў аказала цэнзура, паколькі ўзнікненне, існаванне і скіраванасць таго ці іншага віду ці тыпу выдання часта вызначаліся магчымасцямі, якія прадстаўляліся або, наадварот, не прадстаўляліся выдавецтву цэнзурнымі законамі. У разглядаемы перыяд ва ўмовах жорсткай рэакцыі названы фактар часта вызначаў шляхі дзейнасці многіх выданняў.

Пасля 1905 года Расійская імперыя мела дастаткова развітую сістэму перыядычнай прэсы. Станаўленне друку на яе Паўночна-Заходніх ускраінах ішло паралельна з агульным працэсам трансфармацыі грамадскай свядомасці, змены сацыяльна-эканамічных умоў жыцця краіны. Падзеі першай рускай рэвалюцыі ў Расіі адкрылі шлях самастойнаму сацыяльна-эканамічнаму, палітычнаму і культурнаму развіццю многіх народаў. У гэты перыяд адбывалася інтэнсіўнае фарміраванне беларускай дзяржаўнасці, яе галоўных сацыяльных інстытутаў, адным з якіх з'яўляецца прэса. Нацыянальны фактар у гэты час станавіўся дамінуючым у сістэме грамадскіх сувязей таго часу.

Друк Беларусі ў пачатку XX ст. набываў самастойнасць, выходзіў з-пад улады сталічнага (пецярбургскага і маскоўскага). Тэматыка выданняў значна змянялася ў бок накаплення мясцовай інфармацыі. Скарачаліся афіцыйныя аддзелы галоўных дзяржаўных выданняў. Многія газеты выпускалі асобна афіцыйную і неафіцыйную часткі («Гродненские губернские ведомости», «Минские губернские ведомости»), выходзілі дадаткі, якія друкавалі разнастайную, пераважна мясцовую, інфармацыю камерцыйнага характару (аб'явы аб таргах, цэны на некаторыя тавары спажывання), палітычныя весткі (спісы асоб па выбарах у Дзяржаўную думу, у Дзяржаўны савет), карысныя парады па вядзенню гаспадаркі. Знаходзячыся яшчэ пад моцным уплывам афіцыйнай расійскай улады, правінцыйныя выданні паступова пачыналі адасабляцца, ствараць уласную, скіраваную ў асноўным на мясцовую інфармацыю, сістэму друку.

Газеты і часопісы Беларусі выкарыстоўвалі багаты выдавецкі вопыт Расіі, бо менавіта там склалася і аформілася тыпалогія перыядычных выданняў. Іх працай кіравалі выдатныя расійскія грамадскія дзеячы, пісьменнікі, публіцысты, чыя творчасць стала ўзорам для выданняў, якія ўбачылі свет на ўскраінах імперыі.

На шляху да стварэння нацыянальнай дзяржавы напярэдадні рэвалюцыі 1917 г. перыядычныя выданні Беларусі аформіліся ў асобную сістэму друку, якая, нягледзячы на моцны расійскі ўплыў, мела цэлы шэраг сваіх асаблівасцей. Гэта была нешматлікая, не зусім дасканалая, у многім залежная ад правячых расійскіх колаў, але беларуская прэса .

У міжрэвалюцыйны час друк Беларусі па сваёй колькасці, па тыражу, па якасці змешчаных матэрыялаў выглядаў не горш за сталічны. Урад разумеў, што няма сэнсу стрымліваць развіццё правінцыйнага друку, але ўсё ж такі адмаўляўся вызваліць яго з-пад апекі. Легальнымі і нелегальнымі сродкамі (стварэнне чарнасоценных саюзаў, выданне адпаведнай літаратуры) улады адмаўлялі беларусам ў праве мець сваю прэсу, сваю дзяржаву. Нягледзячы на гэта, у пачатку 1917 г. у Беларусі выдавалася ўжо каля 80 газет [8, с. 65].

Важнасць сістэмнага падыходу да вывучэння друку абумоўлена таксама неабходнасцю мець магчымасць арыентавацца ў вялікай плыні разнастайных перыядычных выданняў, паколькі на працягу часу сістэма змяняецца: з'яўляюцца новыя тыпы выданняў, узрастае тэхнічная аснашчанасць друку, у сувязі з чым змяняецца сам характар журналісцкай працы.

Сістэма друку мае яшчэ адну важную ўласцівасць: яна ў пэўным сэнсе з'яўляецца «неабмежаванай». У выпадку змянення або выпадзення якога-небудзь яе элемента, не парушаецца цэласнасць, як гэта бывае ў арганічных сістэмах. «У неабмежаваным цэлым у сілу менш цеснай залежнасці паміж сістэмай і яе састаўляючымі асноўныя ўласцівасці частак вызначаюцца іх унутранай структурай, а не структурай цэлага. Змяненне сувязей унутры цэлага не выклікае якасных пераўтварэнняў частак. З гэтым звязана здольнасць частак неабмежаванага цэлага да самастойнага існавання» [13, с.178].

Калі падыходзіць да гэтага пытання з пазіцый самых агульных вызначэнняў сістэмы, то можна пагадзіцца з прыведзеным вышэй меркаваннем. Тым не менш, важна помніць, што ў выпадку знікнення якога-небудзь элемента (часопіс, газета) сістэма друку ўсё ж такі страчвае яго, а значыць, знікае частка нашай культуры, грамадскай думкі. І яшчэ: сістэму друку нельга разглядаць як неадушаўлёную, паколькі яе існаванне ажыццяўляецца шляхам узаемадзеяння трох галоўных элементаў масавых камунікацый: выдавецтва – выдання – аўдыторыі, найбольш важным з якіх з'яўляецца апошні. Аўдыторыя вызначае ступень значнасці таго ці іншага элемента ў сістэме перыядычнага друку.

Неабходнасць сістэмнага падыходу да вывучэння сродкаў масавай інфармацыі сёння агульнапрызнаная. На працягу доўгага часу ў журналістыцы складвалася традыцыя вывучэння толькі асобных выданняў з мэтай вызначэння іх скіраванасці, месца ў шэрагу сацыяльна-палітычных поглядаў. Напрыклад, у перыяд СССР вывучаліся толькі партыйна-савецкія выданні. Існаванне астатняй прэсы, у тым ліку і нацыянальнай, або замоўчвалася, або падавалася як негатыўнае. Важнасць сістэмнага падыходу да даследавання друку аспрэчыць нельга, паколькі ён дае магчымасць усебакова разгледзець пэўныя кірункі ў журналісцкай навуцы.

Вывучэнне частак адкрывае магчымасць даследавання сістэмы журналістыкі як адзінага цэлага. Аднак важна таксама ўлічваць і ступень уплыву на развіццё грамадства не толькі асобных выданняў, але і ўсёй іх сукупнасці ў цэлым, ва ўсім адзінстве накірункаў, праграм і меркаванняў. Такі падыход дае магчымасць стварыць у гістарычнай навуцы цэласную карціну ўзаемадзеяння розных грамадскіх рухаў і найважнейшых сацыяльных інстытутаў, вызначыць найбольш уплывовыя з іх.

Прыведзеныя меркаванні даюць нам права сцвярджаць, што развіццё прэсы ў Беларусі ў міжрэвалюцыйны перыяд адбывалася паралельна з развіццём друку ў Расіі. Палітычныя падзеі 1905--1907 гг., перыяду рэакцыі, Першай сусветнай вайны, лютаўскай буржуазнай рэвалюцыі паўплывалі на колькасны рост выданняў, якія склаліся ў асобную сістэму прэсы. Галоўнай адметнасцю беларускага друку стала з'яўленне новага тыпу выданняў — грамадска-палітычных газет і часопісаў на беларускай мове. Гэтая акалічнасць яшчэ раз пацвярджае, што Беларусь у пачатку XX ст. уступала ў новы этап грамадска-палітычных і эканамічных адносін. Створаная сістэма перыядычнай прэсы, дзейнасць якой забяспечвалася ўсімі неабходнымі тыпалагічнымі характарыстыкамі, з'яўляецца аб'ектам асобнага даследавання.